шкодные і бываюць дужа шкодные, як хвароба, каторую завуць—ракам. Да такіх бязшкодных забабоноў залічаю я забабон, што як хто штодзень з левай нагі абуваецца, то яму ніколі ня будуць балець зубы, або каб звясьці ячмень з вока, трэба нюхаць свой кукіш. Першае і другое лекарства, трэба прызнаць бязшкодным. І калі каму стрэліць у галаву перш левую чым правую абуваць нагу, або нюхаць свой кукіш,—ніхай сабе абувае і нюхае на здароўе пакуль не здакучыць яму. Але побач з гэтымі бязвіннымі забабонамі, укараніліся у нас і дужа шкодные, каторые, як рак цела раздедаюць нашу душу.

Адзін з гэткіх зараз—забабоноў ёсць той, што каб стацца інтэлігентным чэлавекам трэба навучыцца толькі „панскай“ мовы і ўсё ўжо гатова. У нашай шчасьлівай старонцы ня розум, ні душа ў цане і пашане, а «панская» мова. Забабон гэты нарадзіўся у панскіх кухнях, перэдпакоях і пекарнях і адтуль, як пошэсць, разліўся па ўсей старонцы і заразіў безмала увесь народ. І каб з гетаго факту судзіць аб усім народзе, то трэба было-б, хіба, прызнаць што наш нэрод—гэта народ слуг і служанак. народ панскіх падлыжнікоў, ці як лепей казаў, бязсьмертны украінскі пісьменнік, Тарас Шэвчэнко, — Варшавське сьметьтя,—гразь Москвы“..

Браты мае! балючая гэта праўда, але яна праўда. Бо ні-ж камуколечы з вас не прыходзілося бачыць такіх „цвэнкаючых“ па польску і „дакаючых“ па маскоўку, пуста-парожніх людзей, каторые аднак пышаюцца тым, што яны «інтэлігенты». Такіх, каторые за сочэвічную юшку прадалі свой гонар народны і такіх лёкайскіх душ, каторые перад панам неважацца выказаць свaей душы, свaей мовы. Такіх, каторые стыдаюцца гаварыць па свойму пры людзях... Не варта было б спыняцца над гэткімі людзьмі, выносіць на сьвет Божы гэткі бруд с сваей, хаты каб гета пошэсць не ўедалася у нашы косьці.

Да тых, хто ешчэ не заражэны гэтым забабонам—хваробай клічу: ваюйце з забабонам — заразай! Тлумачце што інтэлігенція, розум—у галаве; культурнасць у паступках чэлавека, а лекайства ў падлыжніцтве, у сабаччым віляньню хвастом;—ганьба ў здрадзе. Чэсць-жэ і пашана тым, хто беражэ свой чэлавечы і народны гонар.

*Юры Верэшчака.*

---

## Дзед.

Так цёпла цэлы дзень было,
Што дзед—і той сьцягнуўся с печы,
Ля рэчкі сеў, дзе больш пякло,
І грэў над старай сьвіткай плечы.

Сінеўся бор, цекла вада,
Скрозь пахла мёдам і травою...
А дзеду на‘т і ня шкада
Што хутка будзе ён зямлёю.

*Максім Богдановіч.*

---

## НАВУКА.

Знаем мы навуку,
Знаем не адну
Дзедаў дзед праўнуку
Перадаў свайму...

Устаці рана—рана,
Позна легчы спаць,
Працаваць да пьяна,
У поце працаваць.

Што было учора,
Мець ва ўсім гаду
Сеяць зерне - горэ,
Жаць жніво - бяду.

Абіваць парогі
Сыценькім людзям,
Кланяцца у ногі
Злыдням і трутням.

Безпрыпыннай зданьню
Мерыці зямлю,
Віць па прыказаньню
Сам сабе пятлю.

Хто нас верыць вучэ
Летам і зімой.
У брэд яў верыць кучы,
У што ня верэ той,

У родным краю ў хаці
Быці чужаком,
Праўданькі шукаці
У брата кулаком.

І душу і сэрцэ
Весяліць карчмой,
А як ліха ў прэццэ,
Падружыць с турмой.

З Боскаго судженьня
Без пары сканаць,
За ўсе тут мучэньня
У пекле мук чэкаць.

Гэткую навуку
Знаем не адну
Дзедаў дзед праўнуку
Перадаў свайму.

**Янка Купала.**

Акопы 4/VII 13.

---

## Адна.

Адна—ізноў адна, як колас той у полі
Не сцяты ў час жніва нагострэным сярпом,
Зламаны ветрамі гуляючымі на волі
Між апусьцелых ніў, спалосканых дажджом.
Адна... ізноў адна... тужліва сэрцэ ные.
Наўкола пуста, глуш... Ноч цёмная стаіць.
А за вакном віхор так жаласьліва вые,
Якбы сканаць ня мог ня хочучы больш жыць.
І сумна, сумна мне. Дзе ж той каго любіла?
Дзе-ж тые што мяне любілі так даўней?!..
Адны забыліся, другіх ўзяла магіла...
І жаль мне прошлых мар, шчасьлівых шкода дней.
Адна, ізноў адна... а вецер думцы ўторыць
І стогнамі мяне ўцешае ён сваймі:
— Я браг табе, я друг, мне стогнучы гаворыць,
Адзін нас ломіць боль — дык плачмо-ж разам мы...

*К. Буйло.*

---

## Матчын дар.

Як радзіла маці мяне ў цёмну ночку,
Дык дала скрыпіцу.—„На іграй, сыночку,
Грай сабе на щасьця, грай на добру долю,
Грай на век даўгуткі, грай на вольну волю“
Помню дзіцянёткам с тугай я ні знаўся,
Жыў, як тая птушка, граў і забаўляйся,
Дзень мне быў вясёлы, ў ночы сон спакойны
Ой чамуж матуля жыцьцё — скрыпку дала,
Як іх шанаваці ды ні навучала?
Гэта ж падзівіся-я аткрыцца мушу,
Што сапсуў скрыпіцу, што згубіў я душу.
Здаўна сівакрыла шчасьця я ні маю,
Долі я ні бачу, радасьці ні знаю.
Граю, праўда! граю... А на сэрцы цяжка,
А у сэрцы болька аж трываці цяжка.
Тые не прыходзяць пёсьні—весялушкі,
Як пяе зямліца, як шчабечуць птушкі.
Жаль з нудой заплачуць, глуха як зайграю...
Маю я скрыпіцу, а душы ні маю!

*Алесь Гарун.*

---

## Аб усім па троху.

### Статыстыка жыхароу Расеі.

Як відаць з найнавейшых правіцельственных падшчотоў, усяго у Расеі цяпер больш 171 мільёна душ жыхароў. Значэ ад 1897 гаду прыбыло 42 мільёны душ.

Рускіх (лічучы разам і маскалёў і украінцоў і беларусоў) 65 прац. усяго чысла жыхароў гасударства; туркоў і татароў ёсць 10 прац.; палякоў 6 прац.; фінляндцоў 4 прац.; жыдоў 3 прац.; літвіноў 2 прац.; немцоў 1 прац.

Усяго у гасударстве на 1000 душ ёсць 771 селянін, а толькі 107 меш-

---

шмат чаго ёсць, трэба спадзевацца на яго міласць. Ешчэ невядома можэ яна глухая, ці немая, гэта дрэнь, што вочы як тые гузікі тарчаць, а ручкі і ножкі здаровенькіе! Эт, будзе яна хлеб зарабляць мо лепей ад нас ешчэ, ды бацьком пад старасць паможэ, годзі без галоўе і дурнату нейкую плясьці! — Але Магдуля не унімалася.

— Што-ж, матчыно сэрцэ не з зялеза! Атказывала яна, выціраючы кашуляй сьлезы. — Нашаму брату-жэбраку, калі німаеш на паказ калецтва нейкаго, ніхто нават халоднай вады ні дасць!

— О-ей!—пачалі зноў суседкі,—ёсць чаго шкадаваць! дык яна і без жэбрацтва карміцца будзе!

— Не! не! не!—ажно зачырванеўшыся замахала рукамі Магдуся. — Ніхачу ды ніхачу! Хай жабруець, як бацькі і дзяды яе! Так якая-сякая праца не заўсёды-то людзям і патрэбна, а жабраваць заўсёды жабруюць!

Змоўклі кабеты, бо у душы яны ведалі, што яна праўдзіва кажэ. Пагутарылі суседкі ешчэ крыху і разыйшліся па хатах. Гэта было пад вечэр. Сідаронак хоць і быў сьляпы, але у хаці сваей добра ведаў уселякі кут і куточак. Ця перака ён падаў павячэраць жонцы сваей і сам пад‘еўшы выйшоў на двор пагутарыць с суседзямі.

— Ат, — думаў ён, — дачушка мяне некалі будзе вадзіць па людзёх і лагодненька!—А аб тым, што яна будзе пасьля яго сьмерці рабіць ён і не падумаў.

У хаці асталася Магдуля з дачкой сваей. Сперша стагнала яна лежучы на сяніку сваім, пасьля паставіла вячэру на зэдэль і давай ўздыхаць: — Нешчасная! Нешчасная!

Праз маленькую, брудную шыбінку, часам відаць было, як па небу плылі хмары, шэрые і разарваные, бытцым скуматы парванай торбы жэбрацкай. Але скора неба крыху праясьнілося, бо хмары перэплылі і—залаты бліскучы месяц вынырнуў і глянуў у ваконцэ абсыпаючы, усё у хаці дыямэнтовым пылам... Цішыну пэрэрывалі толькі глыбокіе уздохі Магдусі. Вось, бытцым непрытомная, ўстала яна з ложка, выняла зануч дачку сваю і давай зноў азіраць яе. Месяц асьвечаў голае дзіцятка на руках сваей маці.

— Якіе вялікіе вочы! — шэптала Магдуля, пужліва пазіраючы ей у вочы, каторые у праменьнях месяца блішчэлі, бытцым пара маладзенькіх пралесачак...

— Як глядзіць! як глядзіць!—шукаючы нечаго бурчэла Магдуля. Вось палажыла яна дачку на ложэк і сама пайшла шарыць і шукаць па сьценах. Нейкай страшной марай выглядала яна і цень яе пад зіяньнем месяца.

— Чуць знайшла!—прагаварыла яна змарыўшыся, трымаючы нешта бліскучае паміж сваіх пальцоў. Зноў узяла дачку сваю на рукі і паднесла к сьвету да самаго ваконца.

Ешчэ болей заблішчэлі вялікіе вочы маленькай магдусінай дачушкі, здаецца ціха яны угледаліся на красу першаго вечэра, здзіўлена расшыраючыся...

Але, вось Магдуля пачала нешта ей спрытна у тварык саваць. дзіцянё пачало плакаць нейкім праціжным слабым галоскам душэнаго маладога зайчыка. Магдуля засопалася панесла яе скора на ложэк кажучы:

— Ашчасьлівіла цябе, дачушка мая, даражэнькая мая! Ашчасьлівіла!

Яна асьляпіла ей вочы іголкай. . . . . .

*Змітрок Бядуля.*

---

## Кажух старога Анісіма.

### (Казка для старых).

Хто толькі знаў старога Анісіма, той знаў і яго стары кажух. Ніколі ён з ім не разставаўся ні летам, ні зімою. Такі ўжо быў звычай у старога Анісіма. А як ён шанаваў гэты кажух!

Ад доўгіх часоў свайго жыцьця кажух усім Сашмуляўся, выліняў, і сам чорт не сказаў—бы, ці гэты кажух быў белы, ці чырвоны. Ды і самы гэты кажух стаў не падобен да кажуха, а калі яго і называлі кажухом, то называлі ўжо ў сілу звычаю. Паміж мужыкоў было многа жартоў пра гэты кажух. Дзеці проста пальцамі тыкалі на яго, чуць толькі дзед Анісім пакажэцца ў ім на вуліцу.

А дзед як бы і ня чуў, і вухам ня вёў. Толькі ўжо ў канцы як стануць падта дапекаць яму, ён усердуецца.

Калі кажух і трымаўся так доўга, то трымаўся толькі дзякуючы старому Анісіму: чуць гдзе пакажэцца дзірка, Анісім браў голку, ніткі, чэпляў на нос акуляры і садзіўся за рэпарацыю кажуха. Зашые адну дзірку, паложыць латку, прыгладзіць, глядзіш — ў другім месьці кажух разлазіцца. Зноў дзед садзіцца за работу. Потым ён больш нічого і не рабіў, як толькі клаў латкі. Латка чэплялася за латку, то як кастры аладак, то як кучкі медзякоў. І не было на кажусе ні аднаго жывога места: так застракацілі яго белые і чорные ніткі і так патыкала яго голка. А колькі ўсякаго бруду завялося ў кажуху! Ды станоўкі быў гэты дзед: ні чым яго не перэставіш, ніяк не ўдзяўбеш яму ў голаву, што схадней зрабіць новы кажух.

— Ого! Зрабіць новы кажух! Лёгка сказаць «зрабіць новы кажух»,—круціў дзед старымі калтунамі і пачынаў вылічываць і заўсёды канчаў тым, што рабіць новы кажух ешчэ рана.

— Гэ! ці многа ты налічыш, хто-б меў такі добры кажух? Ведаю я цяперэшнюю моду. Зробіць стрынгаля і бегае, як кот с апечэным задам, калі мароз удэрыць, сьмеяўся Анісім.

Бадай ты спрогся, стары пень!—лаяліся мужыкі:—гэта-ж ён расплядзіць такога бруду, што і не акараскацца, заразу развядзе.

І вот маладые хлопцы надумаліся украсьці гэты кажух і спаліць. Але-ж як яго украсці? Праўда, цяпер дзед жыў адзін—ўсе поразбегаліся ад яго. Толькі прусы ды тарканы гнездзіліся ў суседзстве з дзедам. І дзед так шанаваў свой кажух, ніколі з ім не разставаўся і так крэпка з ім зжыўся, што трудна было распазнаць, гдзе пачынаўся дзед і гдзе канчаўся ка-

